ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 91 (1360) | ПАНЯДЗЕЛАК, 20 га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

УСЕБЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-СХОД ЧЫТАЧОЎ „Ч З".

Учора а 7-й гадзіне ўвечары адбыўся Ўсебеларускі радыё-сход комсамольцаў і чытачоў „Ч. З", прысьвечаны X гадоваму юбілею старэйшай комсамольскай газэты „Чырвоная Зьмена".

З дакладам аб рабоце газэты выступіў нам. рэдактара газ. т. Анісаў.

У спрэчках па дакладу прынялі ўдзел Віцебск, Гомель, Орша, Слуцак, зав. „Кастрычнік" (Свіслацкі раён).

(Падрабязная справаздача аб сходзе ў заўтрашнім нумары газ.)

Жорсткі кантроль і самаправерка выкананьня рашэньняў IX зьезду аб ператварэньні УсеЛКСМ у шматмільённую організацыю

Паведамляйце, —чакаем

„УсеЛКСМ у бліжэйшы час павінен стаць шматмільённым"—так сказаў IX Усесаюзны зьезд.

Кайданава, Барысаў, Гомель, Віцебск, Орша і ўсе астатнія 100 раёнаў Беларусі, што вамі конкрэтна зроблена па рэалізацыі гэтага старычнага рашэньня?

Агляд-праверка росту па Менску выявае адсутнасьць сыстэматычнай работы па ўцягненьню. Большасьць колектываў і ячэек растуць „настолькі-паскольку", спадзяючыся на самацёк. Адсутнічае дыферэнцыйны падыход—контынгент рабочай моладзі па рознага роду прадпрыемствах, кваліфікацыях, узростам і нацыянальным складзе не вывучаецца. Афармленьне новаўступаючых затрымліваецца месяцамі.

У выніку—ганебныя лічбы росту. На фабрыцы імя Крупскай, моладзі каля 400. У комсамоле 35 пр. За апошнія тры месяцы комсамольскі колектыў прыняў у саюз усяго 8 чал.

У школе ФЗВ швейнікаў ахоплена комсамолам 27 проц.

Падобныя-ж паказчыкі росту мы сустрэлі па колектывах і ячэйках заводу „Бальшавік", на фабрыцы „Беларусь", вагонна-рамонтных майстэрнях МББ і г. д.

У сваёй апошняй пастанове, па дакладах украінскай, ленінградскай, ніжагародзкай і іванаўскай організацый ЛКСМ, ЦК УсеЛКСМ патрабаваў:

„Неадкладна прыняць меры, якія-б забясьпечвалі ўзмацненьне работы па ўцягваньню рабочай моладзі ў комсамол, больш рашуча змагаючыся з недацэнкай задачы ўцягненьня 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол і ператварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю, не допускаючы разам з гэтым падмены масавай работы па росту голым дэкрэтаваньнем зьверху. Сконцэнтраваць асноўную работу па росту саюзу ва ўдарнай брыгадзе, вылучыўшы ў кожнай ўдарнай брыгадзе комсамольскага організатара, забясьпечыўшы сваім уплывам кожную зьмену, брыгаду, агрэгат, комплект".

ЦК УсеЛКСМ прапанаваў усім камітэтам „вылучыць і паставіць пад свой асабісты нагляд найбольш важныя галіны вытворчасьці і прадпрыемствы данай рэспублікі, краю, вобласьці, а ў прадпрыемствах—найбольш важныя вучасткі вытворчасьці, і вядучыя кваліфікацыі, забясьпечваючы дыферэнцыяваны падыход да работы па ўцагненьню ў комсамол паасобных груп моладзі (кваліфікаванае юнацтва, падлеткі, новыя кадры, дзяўчаты нацменшасьці)".

Даная пастанова надрукаваная намі сёньня і зьмешчаная ў „Комсамольской Праўде" ад 17-IV павінна быць прапрацавана кожным колектывам, кожнай ячэйкай.

Неабходна, пачынаючы ад ЦК і канчаючы комсамольскай групай у агрэгаце, устанавіць жорсткі кантроль над яе выкананьнем.

З свайго боку, „Чырвоная Зьмена" просіць усе РК і ячэйкі прысылаць у рэдакцыю кожную пяцідзёнку зводку аб росьце.

Паведамляйце! Чакаем!

Пастанова ЦК УсеЛКСМ

аб праверцы выкананьня рашэньнаў IX зьезду ЎсеЛКСМ па ўцягненьню рабочай моладзі ў комсамол па дакладах Украінскай, Ленінградзкай, Ніжагародзкай і Іванаўскай організацый УсеЛКСМ

ЦК УсеЛКСМ прызнае выкананьне рашэньняў 9-га Ўсесаюзнага зьезду УсеЛКСМ па ўцягненьню рабочай моладзі ў комсамол з боку украінскай, ленінградзкай, іванаўскай прамысловай і ніжагародзкай організацый слабым. Камітэты гэтых організацый ня здолелі так організаваць работу па росту, каб асноўны ўпор сконцэнтраваць на ўдарнай брыгадзе. зьвяне, каб мэтоды работы і вярбоўкі былі прыстасаваны да асаблівасьцяй асобных груп і кваліфікацый моладзі. Работа гэтых організацый па росту характарызуе агульны, неконкрэтны падыход і адсутнічаньне праверкі выкананьня. Зусім недастаткова ўдзялялася ўвагі вывучаньню запросаў і настрояў рабочай моладзі, няма сапраўднай баявой работы па аказаньню дапамогі з боку камітэтаў у організацыі ўзорнай работы па росту на важнейшых, вядучых прадпрыемствах і цэхах.

Выходзячы з гэтага, ЦК лічыць, што становішча масавай работы ў гэтых організацыях і тэмпы іх росту яшчэ не забясьпечваюць ператварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю.

ЦК УсеЛКСМ прапануе ўсім мясцовым організацыям комсамолу:

1. Бездакладна прыняць меры з тым, каб забясьпечыць узмоцненую работу па ўцягваньню рабочай моладзі ў комсамол, рашуча змагаючыся з недаацэнкай задач уцягненьня 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол і ператварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю, не дапускаць разам з гэтым падмены масавай работы па росту голым дэкрэтаваньнем зьверху. Сконцэнтраваць асноўную работу па росту саюзу ва ўдарнай брыгадзе, вылучыўшы ў кожнай ударнай брыгадзе комсамольскага організатара і забясьпечыўшы сваім уплывам кожную зьмену, брыгаду, агрэгат, комплект.

2. Больш увагі зьвярнуць на расстаноўку работы сярод юнацкай часткі рабочай моладзі (дапамога ў рабоце ўдарным брыгадам, організацыя тэхнічнай вучобы, курсаў, і гурткоў па вывучэньню кваліфікацыі), неадкладна прыняўшы меры да ўзмацненьня работы ў казарме, агульнажыцьцях і інш.

3. ЦК прызнае зусім недастатковай работу па вярбоўцы фабзавучнікаў у комсамол і прапануе ўсім організацыям безадкладна забясьпечыць пры індывідуальным адборы выкананьне ў бліжэйшы-ж час задачы пагалоўнага ўцягненьня фабзавучнікаў у комсамол.

4. ЦК лічыць абсолютна недапушчальным маючыяся затрымкі з афармленьнем новаўступаючых у комсамол і прапануе ўсім камітэтам і ячэйкам забясьпечыць афармланьне ўступаючых у комсамол ня больш, як у двухдэкадны тэрмін ад падачы заявы, да адтрыманьня членскага білету і ўмяняе ў абавязак як камітэтаў, так і рэвізыйных камісій УсеЛКСМ пры яг ваць да самай строгай адказнасьці кіраўнікоў організацыі, аж да зьняцьця з работы тых, якія затрымліваюць афармленьне новаўступаючых у комсамол.

ЦК УсеЛКСМ прапануе ўсім камітэтам УсеЛКСМ праверыць склад камісій па прыему ў КСМ, узмацніўшы іх праверанымі, палітычна пісьменнымі комсамольцамі.

6. ЦК прапануе ўсім камітэтам УсеЛКСМ вывучыць і паставіць пад свой асабісты нагляд найбольш важныя галіны вытворчасьці і прадпрыемства данай рэспублікі, краю, вобласьці, а ў прадпрыемствах—найбольш важныя вучасткі вытворчасьці і вядучай кваліфікацыі. забясьпечваючы дыфэрэнцыяваны падыход да работы па ўцягненьню ў комсамол паасобных груп рабочае моладзі (кваліфікаванае юнацтва, падлеткі, новыя кадры, дзяўчаты, нацменшасьці)

7. Прапанаваць усім організацыям комсамолу, рэдакцыі газэты „Комсомольская Правда" і радакцыям комсамольскіх мясцовых газэт узмацніць вывучэньне і пропаганду лепшых прыкладаў работы організацый па ўцягненьню рабочай моладзі ў КСМ і растлумачэньне задач, пастаўленых 9 зьездам саюзу аб шматмільённым комсамоле, адкрыўшы больш рашучую барацьбу як з недаацэнкай гэтай задачы, панікай перад ёю, так і з настроямі супакаеньня на дасягнутых, зусім яшчэ невыстарчальных тэмпах росту.

Ва ўсей рабоце па ўцягненьню рабочай моладзі ў комсамол ЦК прапануе ўсім мясцовым організацыям комсамолу ўстанавіць жорсткую праверку выкананьня, выкрываючы і змагаючыся з усімі тымі, хто прыкрывае сваю бязьдзейнасьць агульнай фразай, агульнымі азваражаньнямі. У 3-м рашаючым годзе пяцігодкі ленінскі комсамол павінен дасканала навучыцца працаваць па-конкрэтнаму.

Гэтую пастанову абгаварыць ва ўсіх організацыях УсеЛКСМ.

„Ці ня пойдзеш ты ў комсамол"

З 200 чалавек ФЗВ Будвучу толькі 80 комсамольцаў.

Штодзённай работы ў брыгадах, групах па ўцягненьню фабзавучнікаў у комсамол не праводзіцца, а толькі ў час кампаніі і ўрачыстасьцяй.

Надыходзіць, напрыклад, гадавіна Кастрычнікавай рэволюцыі бюро ўзварушваецца, пачынаюць абходзіць кожнага хлопца, кожную дзяўчыну, пытаюць—„ці ня пойдзеш ты ў комсамол".

Рады тады яны кожнаму адказу: „пайду" Няхай такі адказ дае прагульшчык, гультай, што мае па некальні вымоў. Тут ужо ня будзеш выбіраць, калі табе ў аканаку гэтай урачыстасьці неабходны 10-15 заяў у комсамол. Такім чынам прынялі ў комсамол:

Ормана, Голенсона, Гінзбурга, Бэрнштэйна, якія ўвесь час лічыліся ілжэ-ўдарнікамі, гультаямі, атрымоўвалі па некальні раз вымовы ад вучкому. Стаўшы комсамольцамі, яны нікольні не зьмяніліся, дрэнна працавалі, кепска вучыліся, займаліся нават шкодніцтвам—гасілі сьвятло ў час занятнаў, каб зрываць іх. Ды і комсамольская яч. не старалася іх перавыхаваць.

Выклікаты на бюро ячэйкі, комсамолец Бэрнштэйн замест прызнаць свае памылкі, дэманстрацыйна кінуў комсамольскі білет, сказаўшы: „Ён мне не патрэбен. Комсамол мне хлеба не дае, у разрадзе таксама не павышае".

Комсамолец Орман гэткі-ж самы. Адміністрацыя за ўчынкі выключыла яго са школы, а комсамольская ячэйка яшчэ трымае такога комсамольца ў сваіх радох.

Вось вынікі „урачыстай" работы па ўцягненьню ў КСМ і адсутнасьці масавай работы з новаўступіўшымі ў комсамол.

Ня спыняцца на дасягнутым

Комсамольскі колектыў Менскай абутковай ф-кі складаецца з 300 чалавек рабочае моладзі, з іх 225 комсамольцаў.

За час 9-га і 10-га зьездаў комсамолу, колектыў вырас на 35 чалавек. Гэты рост зьявіўся вынікам штодзённай працы комсамольскага колектыву сярод беспартыйнай рабочай моладзі. Комсамолец, працуючы па суседзтву з некомсамольцам праводзіў работу па ўцягненьню яго ў комсамол. Вытворчая комуна вытворчага цэху, дзе былі толькі 3 комсамольцы, у адказ на адозву тульскіх рабочых завербавала 10 чалавек беспартыйнай моладзі ў комсамол.

Аднак як недахоп, трэба адзначыць што 65 чалавек рабочай моладзі, якая амаль уся ахоплена ўдарнымі брыгадамі і вытворчымі комунамі, яшчэ знаходзяцца па-за комсамолам. Ва ўдарным абдзелачным цэху з 40 чалавек рабочае моладзі ў комсамоле толькі 25; загатовачны цэх мае таксама каля 40 чалавек беспартыйнай моладзі.

Брыгадзір „Ч. З." Г. Каплан.

Чаму вы маўчыце?!

Дайце адказ перад партыяй і клясай, як вы змагаецеся за генэральную лінію партыі ў ільна-загатоўках

Запытаньне рэдакцыі да 25-ці сэкратароў Райкамолаў

БССР займае 3-е месца сярод саюзных рэспублік і вобласьцяй па колькасьці загатовак лёну. Між тым, тэмпы працы па ільназагатоўках і вынікі выкананьня гадовага пляну загатовак яўна нездавальняючыя. На 15-IV гадовы плян загатоўкі ільнавалакна выкананы толькі на 40,4 проц., ільна-насеньня-60,5 пр., канапель—62,2 проц. і пянькі—16,4 проц.

У пастановах ЦК ЛКСМБ аб удзеле ЛКСМБ у ільназагатоўках і на старонках газэты „Чырвоная Зьмена" комсамольскія організацыі неаднократна папярэджваліся аб нездавальняючым стане працы па ільназагатоўках. У пастановах ЦК і газэце патрабавалася ад комсамольскіх організацый ужыць самыя энэргічныя захады, каб узьняць тэмпы ільназагатовак і забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну.

Не жадаюць зьняцца з чорнай дошкі

„Чырвоная Зьмена" занесла на чорную дошку за дрэнны ўдзел у ільназагатоўках Мазырскі, Чырвона-Слабодзкі, Сьвіслацкі, Нараўлянскі, Чачэвіцкі і Рагачэўскі райкомы ЛКСМБ. Газэта патрабавала ад гэтых райкомаў ужыць самыя энэргічныя меры барацьбы за лён і ў найкарацейшы тэрмін зьняцца з чорнай дошкі. Але ніводная з гэтых комсамольскіх організацый да гэтага часу не даслала ў рэдакцыю адказу, што яна практычна зрабіла, каб зьняцца з чорнай дошкі.

Мы патрабавалі ад 19 сэкратароў райкомаў: Вузьдзенскага, Кохаsucceeding ханаўскага, Бягомельскага, Любаньскага, Дубровенкага, Брагінскага, Каралінскага, Лядпянскага, Крупскага, Вульскага, Бабруйскага, Камарынскага, Капаткевіцкага, Уварвіцкага, Клічаўскага, Петрыкаўскага, Азарыцкага, Пухавіцкада і Чэрвеньскага раёнаў—даць адказ, што робіць комсамольская організацыя па ільназагатоўках, якія захады прымае, каб ліквідаваць прарыў, выправіць дапушчаныя факты выкрыўленьня клясавай лініі ў ільназагатоўках (недаабкладаньне кулацкіх гаспадарак, несцагнаньне з іх цьвёрдага заданьня і г. д.).

Аднак, з 25 сэкратароў, якія мы запытвалі, у рэдакцыю даслалі адказы толькі тры сэкратары (Быхаўскі, Борквіцкі і Пухавіцкі).

Нашы папярэджаньні ня ўлічаны

Комсамольскія організацыі ня ўжылі захадаў для 100 проц. выкананьня плянаў ільназагатовак. Нежаданьне даць адказ на запытаньне рэдакцыі з боку сэкратароў райкамолу, якія намі занесены на чорную дошку і ад якіх мы патрабавалі тлумачэньня, сьведчыць аб іх нежаданьні заявіць адкрыта перад пролетарскай грамадзкасьцю аб тым, як яны змагаюцца за генэральную лінію партыі ў ільназагатоўках, што імі ўжыта, каб зьняцца з чорнай дошкі, разьбіць правааппортуністычную практыку, нанесьці руйнуючы ўдар па кулаку.

Слова за бюро ЦК ЛКСМБ

Мы ў другі раз зварочваемся да сэкратароў пералічаных у гэтым артыкуле раёнаў і катэгарычна, персанальна ад сэкратароў райкомаў патрабуем адказу: чаму ня ўжыты захады зьняць сябе з чорнай дошкі, што вамі прынята, каб выканаць поўнасьцю плян ільназагатовак, як вы практычна змагаецеся з кулацкім сабатажам і што вамі ўжыта для 100 проц. спагнаньня з кулацкіх гаспадарак лёну, па выяўленьню іх і даабкладаньню, згодна дырэктывам партыі.

Мы катэгорычна патрабуем выступіць праз нашу газэту і ва ўсёй шырыні паказаць партыі і рабочай клясе, як вы змагаецеся за генэральную лінію партыі ў ільназагатоўках.

Адначасова мы зварочваем увагу бюро ЦК ЛКСМБ і просім прыняць адпаведныя меры да сэкратароў гэтых райкамолаў.

Сёньня пачынаецца Ўсебеларускі рацыяналізатарскі зье

ДАЦЬ СОТНІ ПРОЛЕТАРСКІХ ЭДЫСОНАЎ НА СЛУЖБУ ПЯЦІГОДКІ

З усёй бальшавіцкай упартасьцю змагацца за рацыяналізацыю вытворчасьці, за аўладаньне тэхнікай, за 518 і 104

Комсамольскае прывітаньне зьезду ўдарнікаў соцыялістычнай рацыяналізацыі

Сёньня пачынае сваю працу ўсебеларуская рацыяналізатарская конфэрэнцыя. Рацыяналізацыя вытворчасьці зьяўляецца магутнай зброяй у барацьбе за зьніжэньне сабекошту і падняцьце продукцыйнасьці працы.

Узброеныя тэхнічнымі ведамі ўдарныя брыгады павінны ўнесьці карэнны пераварот у справу скарыстаньня матар'ялаў і варштатаў, рабочай сілы і агульны стан выкананьня прамфінпляну.

Барацьба за соцыялістычны абмен вопытам організацыі працы, барацьба за лепшую якасьць продукцыі павінна заняць пачэснае месца ў працы ўдарных брыгад.

Зьезд рацыяналізатараў вытворчасьці, ударнікаў соцыялістычнай рэконструкцыі павінен будзе памеціць конкрэтныя шляхі для далейшай барацьбы па рацыяналізацыі вытворчасьці, прыстасаваўшы гэту барацьбу к задачам поўнага выкананьня народна-гаспадарчага пляну 3-га, рашаючага году і асабліва яго якасным паказчыкам.

Уся барацьба за рацыяналізацыю вытворчасьці павінна быць самым цясьнейшым чынам увязана з паходам комсамолу за тэхніку.

Піонэрам соцыялістычнага будаўніцтва, рацыяналізатам—ударнікам вытворчасьці, магільшчыкам старых адсталых мэтодаў працы—шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

На высшую ступень

Віцебская шчаціннная фабрыка разьбіта на 15 ударных колектываў. Значна разгорнута рацыяналізатарская работа. Ужо сконструявана рассоўная машына, якая дае 4735 р. эконеміі ў год і рад іншых машын.

Але прамфінплян на фабрыцы ўсё-ж ня выкананы. Першы квартал паказаў аб наяўнасьці вялікіх прарываў у працы фабрыкі. Так, за студзень месяц прамфінплян выкананы толькі на 89 проц., люты даў 88 проц. выкананьня, сакавік пераломү ня даў.

Асноўная прычына невыкананьня прамфінпляну, гэта—дрэнная дастаўка сыравіны для фабрыкі, непадрыхтаванасьць да пераводу фабрыкі на іншыя віды сыравіны.

Значна адбілася на выкананьні прамфінпляну і лятунства. Ні фабком, ні партыйная ячэйка ніякай барацьбы з гэтым не вядуць.

Надалей неабходна яшчэ больш разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва і барацьбу з лятунствам, мобілізаваць усе магчымасьці на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Д. Славуцкі.

За соцыялістычны абмен вопытам

Тав. Куйбышаў у сваім дакладзе на УІ-м партзьезьдзе па пытаньню аб магчымай эконіміі ў нашай прамысловасьці пры адпаведнай організацыі рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, адзначыў:

„Пры выпуску ў 18 мллрд. продукцыі прамысловасьцю, якая плянуецца БСНГ-СССР, кожны проц. складае 180 млн. руб.

Мы зможам з'экономіць на 300 млн. руб. паліва, мы можам атрымаць 200 тысяч тон мэталю, лішак, які выдаткоўваецца ў будаўніцтве.

На нядбайным скарыстоўваньні змазкі мы выдаткуем штогод 40 млн. руб., на нерацыянальный тары—50 млн. руб. Гэтыя рублі і тоны мы павінны атрымаць шляхам рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

У гэтай галіне намі зроблена ўжо вельмі многа. Творчая думка бязупынна працуе ў гэтым напрамку. Але да гэтага часу шмат якія вынаходзтвы, альбо рацыяналізатарскія мерапрыемствы, і вельмі часта каштоўныя, заставаліся ў сьценах прадпрыемства.

Вялікую задачу па абмену вытворчым вопытам і рацыяналізатарскімі мерапрыемствам паміж прадпрыемствамі СССР узяла на сябе рэдакцыя картотэкі „соцыялістычны абмен вытворчым вопытам", апіраючыся ў сваёй рабоце ў пяршую чаргу на комсамол.

Першы вопыт ужо паказаў, што гэта картотэка адыгрывае вялікую ролю ў справе перадачы вопыту. Комсамольскі актыў заводу „Чырвоны Выборжэц" (Ленінград) праводзіць у жыцьцё ўзятыя на сябе абавязкі і ў бліжэйшы час перадае ў рэдакцыю картотэкі „СО" 400 рабочых вынаходак і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

„СО" адбірае ўсе каштоўныя рабочыя прапановы і вынаходкі, якія могуць быць выкарыстаны на іншых прадпрыемствах. Для практычнай дапамогі прыцягваюцца інжынэрна-тэхнічныя сілы.

Астатнія прадпрыемствы, адтрымаўшы картотэкі „СО" па пытаньнях, зьвязаных з работай на „Чырвоным Выбаржцы", абгаварваюць унесеныя прапановы на вытворчых нарадах і вывучаюць каштоўнасьць прымяненьня гэтых прапаноў на сваім прадпрыемстве.

У БССР ёсьць шмат каштоўных вынаходзтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў, якія патрабуюць безадкладнага апублікаваньня і распаўсюджваньня. Неабходна, каб зборам прапаноў і перадачай гэтага вопыту заняліся ўсе ўдарнікі-рацыяналізатары, каб кожная ўдарная брыгада стала брыгадай рацыяналізацыі.

Картотэка „СО" павінна быць самым шырокім чынам популярызавана сярод рабочых мас з тым, каб забясьпечыць пасьпяховае разгортваньне гэтай работы. На прынцыпах соцспаборніцтва, неабходна дамагацца больших рамог у гэтай галіне.

Да гэтай справы павінны быць п цягнуты ўсе інжынэрна-тэхнічн сілы, каб забясьпечыць правільнае ск даньне чарцяжоў, апісаньне сутнас вынаходзтва, увязваючы гэту раб з барацьбой за аўладаньне тэхнік

Па пляну, рэдакцыя картотэкі м куе выдаць у гэтым годзе 30 ты такіх практычных картак. Плян г зусім рэальны і павінен быць вы наны.

У сваім заключным слове на зьезьдзе УсеЛКСМ т. Кагановіч с заў: „У галіне рацыяналізацыі і т нічных вынаходзтваў, а таксама рэа зацыі прапаноў. комсамол робіць то кі першыя крокі".

Трэба, каб гэтыя крокі былі цьв дымі і ўпэўненымі. Конкрэтнай бара бою за разгортваньне рацыяналізата скага руху і соцыялістычнага абме вопытам дабіцца замацаваньня і п лыбленьня дасягнутых першых крок

М. Перэльман.

Выканаць вынесеныя пастановы

Завод „Пролетары" (Гомель) мае магчымасьці рэалізаваць высунутую задачу аўладаньня тэхнікай. Той факт, што ліцейны цэх заводу мае вялікі проц. браку, зьяўляецца вынікам таго, што рабочыя не аўладалі тэхнікай сваёй вытворчасьці.

Вельмі часта псуюцца варштаты,

Група ударнікаў-рацыяналізатараў заводу „Камунар" (Менск).

бо рабочыя ня ведаюць як імі карыстацца і лепш організаваць працу, што вельмі хваравіта адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

Сход комсамольскага колектыву, сумесна з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі, а таксама цэхавыя сходы і спэцыяльна пашыранае бюро колектыву, сумесна з І. Т. Р. вызначылі далейшыя шляхі ўдзелу комсамолу і рабочай моладзі ў паходзе за тэхніку і рацыяналізацыю вытворчасьці. Была вылучана камісія, у якую ўвайшлі комсамольцы, прадстаўнікі заўкому і І. Т. Р. для выпрацоўкі програмы тэхнічнага навучаньня па ўсіх цэхах.

Пасьля гэтых сходаў больш ніякай работы па разгортваньню тэхнічнай вучобы і барацьбы за рацыяналізацыю вытворчасьці ня бы праведзена. Комсамольцы і рабоч імкнуцца вывучаць тэхніку, а няўдалая організацыя работы г біць гэтую справу.

Ячэйка механічнага цэху правал сход сумесна з І. Т. Р., дзе бы вынесена пастанова аб організа брыгадных гурткоў па вывучэньні тэхнікі, але гэта пастанова ня была праведзена ў жыцьцё.

Комсамольская ячэйка чыгуналіцейнага цэху зусім не разьбірала пытаньня аб аўладаньні тэхнікай. АПО працаўнік, т. Ліўшыц гаварыць: „Вось нам прышлюць програму, тады мы і будзем рабіць".

Неабходна разгарнуць работу па рацыяналізацыі і мэханізацыі заводу, за поўнае скарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў.

Ня можа быць ніякага спасыланьня на самацёк у барацьбе за аўладаньне тэхнікай і рацыяналізацыю вытворчасьці.

Брыгада „Чырвонай Зьмены": Крукоўскі, Гурэвіч і Марозаў.

Ліквідаваць прарыў

На заводзе „Зьвязда" (Капцэвічы) соцспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнута зусім слаба. У сушыльным цэху заданьне выконваецца толькі на 60 проц. Прычына: невыстарчальны ціск у паравых катлох, які даходзіць да 3-4 атмосфэр, замест патрэбных 7-8.

Дзяжурныя майстры няўважліва адносяцца да сваёй працы. Рабочыя прапановы не рэалізуюцца.

Гарбачэнка.

ГУРАГАННЫ АГОНЬ ПА ЧУДЗІНШЧЫНЕ!

Наносіць сакрушальны ўдар па носьбітах варожай ідэолёгіі, бязьлітасна змагацца за ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі партыі

Бялянскі, Крохін, Казека—падпявалы Чудзіна

Нежаданьне вывучаць і ўжываць беларускую мову—звычайная зьява сярод настаўніцтва Мёнскага Політэхнікуму Сувязі. Выкладчыкі Бялянскі, Крохін, Казека свае лекцыі выкладаюць на расійскай мове і ўпарта не жадаюць беларусізавацца.

Уся праца Політэхнікуму не беларусізавана, ня гледзячы на тое, што ў дагаворы па соцспаборніцтву сказана аб пераводзе ўсёй працы на рэйкі беларусізацыі. Комсамольская ячэйка і прафком ня сочаць за выкананьнем гэтага пункту дагавору.

Павінны быць ужыты рашучыя меры з тым, каб упарта і пасьлядоўна ажыцьцяўляць беларусізацыю ў Політэхнікуме сувязі. Трэба панесьці рашучы адпор усім тым, хто ігнорує беларусізацыю, хто падпявае Чудзіну.

Р. М.

Работа з працоўнай моладзьдзю нацменшасьці—у загоне

Капыльскі РК ЛКСМБ з 5 капыльскіх местачковых ячэек не вядуць ніякай працы з працоўнай моладзьдзю нацменшасьцяў. Комсамольская ячэйка м. Капыля складаецца з беларусаў і яўрэяў—комсамольцаў іншай нацыянальнасьці ў ячэйках няма. У Капылі ёсьць моладзь польская і татарская нацыянальнасьцяў, якая блізка да комсамолу па свайму соцыяльнаму стану, але з гэтай працоўнай моладзьдзю нацменшасьцяў ніякай работы комсамольскія ячэйкі не вядуць.

К.—К.

Чудзін выключан з комсамолу і саюзу

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены", даведаўшыся аб выхадзе махровага велікадзяржаўнага шовіністага, „комсамольца" Чудзіна, телеграфна запытала Жыткавіцкі райком ЛКСМБ аб мерах, ужытых да яго. РК ЛКСМБ паведамляе:

18.IV.29 [illegible]
Жыткавічы [illegible]
Мінск Чырвонай Зьмене
Чудзін выключаны комсамолу союзу звольнены працы [illegible] комсамолу союзу
райкомол [illegible]

Віцебляне праводзяць праверку ступені беларусізацыі комсамольцаў

Віцебскі гарком ЛКСМБ, у сувязі з праведзеньнем інтэрнацыянальнай эстафэты, ухваліў:

„Лічыць неабходным, з мэтай узмацненьня работы па беларусізацыі, згодна з пастановай Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, правесьці 21-га красавіка на ўсіх ячэйках адзіны дзень персанальнай праверкі комсамольцаў, каб выявіць наколькі яны разумеюць нацполітыку і ў якой меры аўладалі беларускай мовай.

Прапанаваць усім ячэйкам забясьпечыць поўную яўку комсамольцаў на гэтыя сходы праверку. Раіць ячэйкам наступны парадак праверкі: распрацоўка пастановы ЦК аб становішчы беларусізацыі, персанальная праверка.

Прапанаваць колектыву Белпэдтэхнікуму вылучыць 80 асоб, колектыву Пэд'інстытуту 40 асоб, якія добра ведаюць беларускую мову, у дапамогу правядзеньню праверкі па вытворчых ячэйках ЛКСМБ.

На матар'ялах праверкі кожнай ячэйцы выпрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы для палепшаньня беларусізацыі ў організацыі."

Тэлеграма ўсім райкомам партыі і РВК

15-га красавіка па БССР выканана каля 50 проц. пляну кантрактацыі яравых. Апошні тэрмін, устаноўлены ЦК УсеКП(б), прайшоў. Пляны кантрактацыі 15-га красавіка выканалі толькі Крычаўскі, Койданаўскі і Клімавіцкі раёны. Рэзкае зьніжэньне тэмпаў у апошнюю пяцідзёнку сьведчыць аб невыстарчальнай рабоце, стаўцы на самацёк што пагражае зрывам кантрактацыі.

Асабліва дрэнна выконваюцца пляны кантрактацыі рашаючых ва ўмовах БССР культур—лёну і бульбы.

Яшчэ горш—кармовых траў і сена.

Ва многіх раёнах ня скончан адвод сельсаветаў для кантрактацыі бульбы спажыўкооперацыяй. Прапануецца ў адзначаны тэрмін скончыць разьмеркаваньне сельсаветаў, не дапушчаючы далейшых пераразьмеркаваньняў.

ЦК і СНК катэгорычна ставяць перад раённымі партыйнымі і савецкімі організацыямі задачу—скончыць 100 проц. кантрактацыю ўсіх культур на працягу бліжэйшых дзён. Уцягнеце ў выкананьне гэтай задачы ўвесь раённы актыў і настаўніцтва. 20-га красавіка тэлеграфуйце ЦК і СНК аб выніках кантрактацыі па вашым раёне.

ЦК КП(б)Б ГЕЙ
СНК ГАЛАДЗЕД.

СПАЗЬНЕНЬНЕ ВЯСНЫ СКАРАЧАЕ ТЭРМІНЫ СЯУБЫ

Шырокім разгортваньнем соцспаборніцтва і ўдарніцтва ўзьнімем тэмпы падрыхтоўкі

ЛІКВІДУЕМ АБЯЗЬЛІЧКУ І ПЕРАВЯДЗЕМ КОЛГАСЫ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ З УЛІКАМ У ПРАЦАДНЁХ

Абвяшчаем сябе мобілізаванымі на лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай

Раённая конфэрэнцыя комсамольскага актыву, сумесна з рабочай, батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзьзю ўсяго Б.-Кашалеўскага раёну, шле шчырае прывітаньне ЦК ЛКСМБ і яго органу—„Чырвонай Зьмене“.

Мы, удзельнікі конфэрэнцыі, сумесна з батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзьдзю, лічым сябе мобілізаванымі на лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы.

У сусязі з набліжэньнем 10-ці гадовага юбілею газэты „Чырвоная Зьмена“—стойкага маладога барацьбіта за генэральную лінію партыі, конфэрэнцыя бярэ на сябе абавязак павялічыць да дня юбілею падпіску на газэту „Чырвоная Зьмена“ да 600 экзэмпляраў.

Нахай жыве ленінскі комсамол—непасрэдны дапаможнік партыі ў соцбудаўніцтве!

Няхай жыве суцэльная колектывізацыя—шлях перабудовы вёскі на социялістычныя рэйкі!

Уперад, па-баявому,—за бальшавіцкія тэмпы! **Прэзыдыум.**

Да юбілею „ЧЗ“—ліквідаваць прарывы

ВУШАЧЫ.—Гарадоцкі с-савет у падрыхтоўцы да сяўбы мае вялізарныя прарывы. Колектывізавана толькі 12 проц, бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Кантрактацыя не праводзіцца. Інвэнтар ня ўвесь адрамантаваны. Улічваючы гэта комсамольская ячэйка ўключылася ў месячнік баявой вясеньняй трывогі па ліквідацыі прарываў. Комсамольцы разьбіліся на 6 штурмавых брыгад, якія прыступілі, сумесна з сельсаветам да даводзеньня пляну да вёсак і двароў.

Ячэйка паставіла сабе задачай: да юбілею „Чырвонай Зьмены“ ліквідаваць усе прарывы і падрыхтавацца поўнасьці да вясеньняй сяўбы. **Г. Я.**

З прычыны дрэнных кліматычных умоў, вясеньні сеў у гэтым годзе значна зацягваецца. Скарачаюцца тэрміны правядзеньня пасеўкампані, што патрабуе ад колгасаў і аднаасобных гаспадарак найлепшай падрыхтоўкі з тым, каб у мінімальна короткі час правесьці засеў.

Галоўнейшая ўмова для пасьпяховага правяззеньня пасеўкампаніі—дакладная ўсебаковая падрыхтоўка, правільная расстаноўка рабочай і цягавай сілы.

Комсамольскія ячэйкі павінны выкарыстаць правядзеньне месячніка баявой вясеньняй трывогі для заканчэньня пераводу колгасаў на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх і ліквідацыі абязьлічкі.

Толькі дакладнай падрыхтоўкай і ўдарнымі тэмпамі работы ў час сяўбы мы зможам пасьпяхова выканаць задачы пастаўленыя перад вясеньняй сяўбой, і дабіцца новага магутнага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы.



Колгасьнікі праводзяць пробны выезд у поле

Клімаўшчына на подступах ДА СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Клімавічы (ад нашага юнкора).

Па ўсіх колгасах і вёсках раёну праводзіцца ўдарная падрыхтоўка да другой колгаснай бальшавіцкай сяўбы. Ва ўсёй гэтай падрыхтоўцы ставіцца першай задачай правядзеньне колектывізацыі. За гэты час узьнялася вялікая хваля колгаснага руху. На 10 красавіка раён колектывізаваны на 52 проц. Організавана новых 20 колгасаў, якія аб'ядналі 550 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У старыя колгасы ўлілося 1700 гаспадарак. У аснову організацыі колгасаў бралася стаўка не на карлікавыя, а на буйныя колгасы.

Па раду с-саветаў у асноўным заканчваецца суцэльная колектывізацыя. Так, Пуцімэнскі с-савет колектывізаваны на 92 проц., Нова-Дзедзенскі—на 85 проц., Гусарскі—на 80 проц.

Колгасы ў асноўным падрыхтаваны да сяўбы.

Т. Упарты.

Слуцкі комсамол праводзіць колгасна-вытворчы бой

Пленум Слуцкага РК комсамолу вынес пастанову правесьці ў концы сяўбы раённы колгасна-вытворчы бой. Колгасна-вытворчы бой ставіць мэтай праверыць наколькі комсамольская організацыя выканала пастановы IX і X зьездаў комсамолу аб поўным і сапраўдным павароце да колгасна-вытворчых задач, як на практыцы мобілізоўвалі масы навокал вытворчых задач колгаснага будаўніцтва. Бой выявіць наскольскі паасобныя комсамольскія ячэйкі справіліся з другой бальшавіцкай сяўбою, як праведзены ў жыцьцё пастановы VI-га зьезду саветаў у колгасным будаўніцтве аб пераводзе колгасаў на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, як праводзіліся мерапрыемствы „Чырвонай Зьмены“ па ліквідацыі абязьлічкі, аўладаньні агротэхнікай і разгортваньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Устаноўлен на пераходны сьцяг РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ, які будзе перададзены тэй ячэйцы, якая лепш выканае адзначаныя задачы. Акрамя Чырвонага сьцягу, лепшыя ячэйкі будуць прэміраваны бібліотэкамі, спорт-інвентаром і інш. Ячэйкі, якія ня вытрымаюць экзамен бальшавіцкай вясны і колгасна-вытворчага бою, таксама атрымаюць „прэмію“: ордэн чарапахі і сьцяг з рагожы. Гэты ордэн і сьцяг будзе замацованы за ячэйкай да таго часу, пакуль сваёй практычнай работай яна ня здыме чорнай плямы.

Для падрыхтоўкі і правядзеньня колгасна-вытворчага бою складзены штаб. Такія самыя штабы організоўваюцца і пры комсамольскіх ячэйках. Колгасна-вытворчы бой будзе экзаменам для Слуцкага комсамолу.

Брыгадзір „Ч. З.“ Прыбытак Ян.

Вынік пасеўнай трывогі—70 колгасьнікаў

Слуцак. Сярэдзікоўскі с-савет стаіць у першых радох па колектывізацыі раёну. С-с колектывізаваны на 50 проц. Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правядзеньню вялікай масавай работы с-саветам і вярбовачнымі брыгадамі з колгасьнікаў.

У вёсцы Баслаўцы за час месячніка баявой трывогі комсамолу ўлілося ў колгас 20 гаспадарак. Колгас „Прамень „Комуны“ вырас з 5-ці гаспадарак да 40, за апошнюю дэкаду ўлілося новых 10 гаспадарак.

У Лапацінкі колгас уступіла т-ва па сумеснай апрацоўцы зямлі, якая мелася ў вёсцы.

У выніку распрацоўкі пастаноў VI-га зьезду і пераводу колгасаў на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, узьняўся яшчэ большы прыток у колгасы.

10-га красавіка па сельсавеце быў праведзены пробны выезд колгасу ў поле.

Пробны выезд паказаў, што колгасы да сяўбы падрыхтаваны.

Юрка Рудзько.

Колгас узяў на грамадзкі буксір аднаасобнікаў

8-га красавіка г. г. колгас „Чырвоны сьцяг“, Сардыкага с-савету, Дрысенскага раёну, організаваў пробны выезд у поле.

Па прыкладу і ініцыятыве колгасу „Чырвоны сьцяг“ аднаасобнікі прылеглых да яго вёсак (в. Габулі і інш.) у гэты дзень таксама організавалі пробны выезд у поле.

Выезды паказалі, што аднаасобнікі пакуль што ў падрыхтоўцы да сяўбы значна адсталі ад колгасьнікаў. Сельска-гаспадарчы інвэнтар ня ўвесь адрамантаваны, ня ссыпаны насенныя фонды.

Пост „Чырвонай Зьмены“ П. Ц.-а

ВЫПРАЎЛЯЕМ ПАМЫЛКІ КОНКРЭТНЫМІ СПРАВАМІ

„Чырвоная Зьмена“ па Дукорскай справе дапусьціла грубую політычную памылку, зьмясьціўшы ад 20 студзеня 1931 г. № 15 неправераны, компромэнтуючы юнкораў матар'ял:—„Ці могуць яны быць юнкорамі“.

На фоне існаваўшай опортуністычнай практыкі і заціску самакрытыкі ў Сьмілавічах, зьмяшчэньне гэтага матар'ялу ў газэце зьявілася для сьмілавіцкіх опортуністых, бюрократаў шыльдай, з-за якое яны павялі атаку і цкаваньне актыўных юнкораў Лявіцкага і Піскуна.

Носьбіты махровага опортунізму, заціскачы самакрытыкі, алілуйшчыкі ў райкому, якіх бязьлітасна білчавалі юнкоры сваім вострым пяром, скарыстаўшы матар'ялы „Чырвонай Зьмены“, зрабілі свой прысуд: выключылі Лявіцкага з комсамолу, зьнялі з грамадзкай працы, і, на радасьць клясаваму ворагу, організавалі грамадзкае ганьбаваньне юнкораў.

„Чырвоная Зьмена“, аддаўшы на суд заціскачоў самакрытыкі сваіх юнкораў, па сутнасьці об'ектыўна садзейнічала заціску самакрытыкі, цкаваньню і ганеньню юнкараў.

Таму зусім правільнымі зьяўляюцца рашэньні сэкратарыяту ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б па сьмілавіцкай справе і ацэнка ў гэтай справе ролі „Ч. З.“, а таксама крытыка памылак „Чырвонай Зьмены“ з боку ЦО КП(б)Б „Зьвязды“.

„Чырвоная Зьмена“ паглыбіла гэтую памылку яшчэ і тым, што, зьмяшчаючы матар'ялы працаўніка рэдакцыі пасьля высьвятленьня справы, вычарпальных політычных вывадаў не зрабіла, а таксама не раскрытыкавала перад пролетарскай грамадзкасьцю сваю памылку.

Аналёгічны гэтаму факт—гэта справа з сялькорам газэты „Колгасьнік Беларусі“ тав. Фясько. У нумары 225 ад 22 сьнежня 1930 году „Чырвоная Зьмена“ зьмясціла артыкул „Тэрорыстычны акт клясавага ворага“ па справе замаху групы кулацтва на забойства старшыні Старалішчанскага сельсавету (Бешанковіцкі раён).

Выкрываючы зусім правільна клясавую сутнасьць справы, мобілізуючы ўвагу пролетарскай грамадзкасьці вакол гэтага конкрэтнага акта клясавай барацьбы, на бязьлітаснае змаганьне з клясававарожымі элемэнтамі, „Чырвоная Зьмена“ беспадстаўна абвінаваціла Фясько ў тым, што ён сьлепа дапамагаў клясаваму ворагу, тады як уся віна Фясько заключалася ў некрытычным падыходзе да розных заяў, якія яму падаваліся.

Дукорская справа для „Чырвонай Зьмены“ зьявілася вялікім політычным урокам, з якога газэтаю зроблены патрэбныя вывады. Газэта чула, уважліва адносіцца да сваіх юнкораў.

Прыкладам гэтага можа быць справа з юнкорам-комсамольцам Прыбыткам. На працягу доўгага часу былое кіраўніцтва Слуцкага райкому ЛКСМБ абзывала юнкора Прыбытка кулацкім падпявалай, агентам клясавага ворага, ілжэ-селькорам, пішучы хлусьлівыя заметкі. Дайшло нават да таго, што былы АПО РК ЛКСМБ Рапапарт на раённым зьлёце „лёгкай кавалерыі“ выкрыў сапраўднае прозьвішча. А былы сэкратар РК КСМ Айзэнштадт, без пастановы ячэйкі і прафкому, адабраў у Прыбытка комсамольскі білет.

„Чырвоная Зьмена“ накіравала свайго прадстаўніка на месца. Высьветліла сутнасьць справы і, замест прад'яўленых Прыбытку абвінавачваньняў установлены факты заціску самакрытыкі з боку былога кіраўніцтва РК КСМ, цкаваньне юнкора Прыбытка, нерэагаваньне на зусім правільныя яго заметкі. Яры заціскач самакрытыкі Рапапарт за цкаваньне і выкрыцьцё юнкора выключан з партыі і атрымаў заслужанае пакараньне ад суда—год умоўна.

Зараз распачата расьследваньне новай справы—юнкора Міхася Ракіты.

„Чырвоная Зьмена“ ўзялася за сталае вывучэньне твару сваіх юнкораў ударнікаў, правярае іх на практычнай рабоце, організоўвае з імі выхаваўчую работу. І грубую ў гэтых адносінах політычную памылку, допушчаную па дукорскай справе, „Чырв. Зьмена“ на справе выпраўляе: організацыяй масава-опэрацыйнай работы, разгортваньнем сыстэматычнай работы сярод юнкораў.

Газэта ператвараецца з так званага фотографа голых фактаў, штампоўшчыка—у сапраўднага організатара мас комсамольцаў і беспартыйнай моладзі на барацьбу за генэральную лінію партыі.

„Чырвоная Зьмена“, высунуўшы лёзунг ператварыць Беларусь у торпяны Донбас, зараз-жа вакол яго выкананьня організавала юнкораў, стварыла сквазны кантроль за выкананьнем пляваў торпаздабычы, спэцыяльныя пасты на торпзаводах, ва ўстановах, што маюць дачыненьне да торпарапрацовак.

Высунуўшы лёзунг ліквідаваць абязьлічку ў саўгасах, колгасах, газэта да яго практычнага ажыцьцяўленьня прыцягнула таксама і юнкораў, організавала спэцыяльныя брыгады, пасты.

Організоўваючы работу па разьвіцьцю вядучых высока-таварных галін і культур сельскай гаспадаркі „Чырвоная Зьмена“, каб паказаць, як трэба працаваць організавала ў Бабруйскім раёне 5 юнкораўскіх брыгад. Праз юнкораўскія рэйды праверыла стан падрыхтоўкі да сяўбы і ўдзелу ў ёй комсамолу. Пры ўдзеле юнкораўскіх брыгад складзены плян конкрэтных дзеяньняў, сустрэчны плян другой бальшавіцкай у Бабруйскай раённай комсамольскай організацыі. Для практычнай рэалізацыі гэтага пляну, у ячэйках організаваны брыгады, пасты „Чырвонай Зьмены“, якія сочаць і дапамагаюць комсамольскім ячэйкам у працы па выкананьню вызначаных маршрутаў, дапамагаюць ячэйкам больш правільна расставіць свае сілы, сконцэнтраваць агонь сваёй барацьбы на важнейшых вучастках работы па правядзеньню 2-ой бальшавіцкай вясны.

Гата далёка няпоўныя факты работы з юнкорамі, перабудовы работы газэты, увядзеньня ў сыстэму газэты масава-опэрацыйнай работы.

У напрамку практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі, комсамолу, ацэнкі рашэньняў усесаюзнай рабселькораўскай нарады аб тым, што кожны рабселькор ударнік, кожны ўдарнік-рабселькор, „Чырвоная Зьмена“ організавала да 60 юнкораўскіх брыгад, устанавіла рэгулярны інструктаж юнкораў.

„Чырвоная Зьмена“ з непрымірымай бальшавіцкай напорыстасьцю будзе рашуча змагацца за разгортваньне і дзейснасьць крытыкі і самакрытыкі супроць заціскачоў опортуністых рознага колеру.

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох соцыялістычнага будаўніцтва



Хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва ўсё больш і больш ра гортваецца ў масах рабочае клясы.

Новыя кадры нашай прамысловасьці, якіх рыхтуе ФЗВ, гэта—ня толькі высока-кваліфікаваныя рабочыя, гэта—клясава - сьвядомыя, адданыя справе рабочае клясы будаўнікі.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва стала штодзённым мэтодам у навучальнай працы.

Дзякуючы яго шырокаму разгортваньню, Барысаўскі будвуч значна падвысіў якасьць работы і павялічыў вытворчасьць. Дзякуючы ўдарнай прапрацоўцы навучальных матар'ялаў, вучні датэрмінова канчаюць школу.

Яны і на будоўлі будуць організатар мі соцспаборніцтва і ўдарніцтва,

Сёньня яны—ударнікі цэхаў вучобы.

Заўтра—ударнікі нашай будоўлі.

На здымку: Лепшая (прэміяваная) ударная брыгада Будвучу Пяцкурэнка, Філіпаў і Бурко.

Опэрацыйная зводка

НА ФРОНТ БАРАЦЬБЫ

ЗА БАЛЬШАВІЦКІ ФІНПЛЯН

кінуць баявыя падрыхтаваныя кадры

Каб забясьпечыць выкананьне фінпляну 3-га рашаючага, трэба пасьпяхова вырашыць проблему кадраў крэдытна-фінансавай сыстэмы.

Людзі, якія кіруюць мобілізацыяй сродкаў, павінны быць ня толькі тэхнічнымі выканаўцамі працы, а організаторамі актыўнасьці мас. Разам з усёй грамадзкасьцю організоўваць масавы прыліў вольных сродкаў нясельніцтва—павінны быць клясава-вытрыманымі, адданымі барацьбітамі на фронце выкананьня фінпляну.

Праводзячы праверку выкананьня соцумовы з Украінай па выкананьню фінпляну 3-га рашаючага, мы зьвяртаем увагу ўсяе організацыі на неабходнасьць значна ўзмацніць працу комсамольскіх ячэек у галіне забясьпечаньня нізавога зьвяна фінансавай сыстэмы клясава-вытрыманымі кадрамі.

Чарговымі на праверку выходзяць Дубровенскі, Чачэрскі і Багушэўскі раёны.

Узмацніць фінапарат

Ва ўмовах напружанай працы па выкананьню фінпляну незабясьпечаньне крэдытнафінансавай сыстэмы кадрамі набывае асабліва важнае, а часам рашаючае значэньне. Асабліва востра стаіць пытаньне кадраў у нізавым зьвяне фінансавай крэдытнай сыстэмы і ў першую чаргу ў ашчадкасах.

Факты невыкананьня пляну мобілізацыі сродкаў у першым квартале, наяўнасьць раёнаў, выканаўшых фінплян толькі на 50 проц., некаторы адліў укладаў—ёсьць часткова вынік слабасьці апарату крэдытна-фінансавай сыстэмы.

Пры гэтым забясьпечаньні фінансава-крэдытнай сыстэмы кадрамі, мы маем факты, якія сьведчаць аб тым, што раённыя кіраўніцтвы опортуністычна недацаньваюць вялікага значэньня працы фінустаноў. Па 28-мі раёнах за студзень-сакавік было мобілізавана звыш 70 працаўнікоў па розных кампаніях, і амаль ніводзін раён ня прымае захадаў, каб умацаваць фінапарат за лік прасоўваньня лепшай часткі колгасьнікаў, батракоў, беднякоў.

У раёнах, дзе была праведзена належная праца па высоўваньню ў фінапарат, былі дасягнуты значныя посьпехі, што цалкам абвяргае ўстаноўку опортуністых.

Організаваныя ў некаторых раёнах фінкурсы недаўкамплектаваны, бо райкіраўніцтва недацаньвае гэтую справу. Некаторыя раёны, як Чашніцкі і інш. зусім не прыслалі людзей. Раённыя профсаюзныя, партыйныя і комсамольскія організацыі нічога ня робяць, каб дапамагчы ў працы ўжо адкрытым курсам. Бязьдзейнасьць некаторых організацый у падрыхтоўцы фінкадраў, жаданьне адмахнуцца ад гэтай працы, як другараднай, тармозіць выкананьне фінпляну, што ёсьць праявай правага опортунізму на практыцы.

Пастановай ЦК УсеКП(б) ад 15-га красавіка 1931 году аб умацаваньні сыстэмы НКФ і пастановай ЦК КП(б)Б ад 25 сакавіка намечан рад конкрэтных мерапрыемстваў па ўмацаваньню фінапарату за лік звароту былых фінработнікаў, пераводу працаўнікоў з іншых галін, максымальнага пашырэньня сеці навучальных установ.

Некаторыя ўстановы і кіруючыя ігнаравалі гэтыя пастановы. Вушацкі Райфа ў канцы сакавіка перакінуў інспэктара па прыбытках і страхаваньню на іншую працу і пакінуў апарат ашчадкасы без работнікаў. Азарыцкі РВК паведамляе, што інспэктар па прыбытках прызначаны на адказную пасаду РВК. У Чырвона-Слабодзкім раёне інспэктар па страхаваньню часова перакінуты на іншую працу.

Гэтыя факты сьведчаць аб наяўнасьці нездаровых настрояў і дзеяньняў, якія ставяць пад пагрозу зрыву выкананьне пастановы ЦК аб забясьпячэньні фінансавай справы кадрамі.

Асноўная задача партыйных, савецкіх, профсаюзных і комсамольскіх організацый—правесьці ў жыцьцё пастановы ЦК аб умацаваньні фінапарату ўжо ў бліжэйшыя месяцы.

Загадчык сэктару кадраў НКФ—Спарыхін

Ніводнага колгасу, саўгасу без насьценгазэты, альбо шматтыражкі

Лепшым падарункам да 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены" будуць новыя сотні насьцэнгазэт і тысячы ўдарнікаў—юнкораў

„Чырвоная Зьмена" 24-красавіка зьвярнулася да ўсіх комсамольцаў, рабселькораў і юнкораў раённых газэт з заклікам па-ўдарнаму ўзяцца за практычную організацыю да пачатку вясеньніх палявых работ у саўгасе, колгасе, МТС—насьценгазэт, альбо шматтыражак.

„Чырвоная Зьмена" прасіла сваіх юнкораў дапамагчы выканаць дырэктыву партыі аб нізавым друку.

Некаторыя раёны практычна прыступілі да гэтае працы. Напрыклад, Слуцкі РК ЛКСМБ сумесна з юнкорамі оргінізаваў ужо ў 4-х колгасах насьценгазэты.

Але-ж гэта толькі адзінкі. Астатнія раёны, ня гледзячы на пастанову ЦК ЛКСМБ ад 12-га красавіка і адозву „Ч. З.", амаль нічога не зрабілі ў напрамку разгортваньня нізавога друку па раёнах.

Неабходна зараз-жа па-баявому пераключыцца на выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, а таксама адозвы „Чырвонай Зьмены" аб абавязковай організацыі ў кожным саўгасе, колгасе, брыгадзе насьценгазэты, альбо шматтыражкі.

ЮНКОР З 5-ЦІ ГАДОВЫМ СТАЖАМ

Вярнуўшыся да хаты, я застаў ліст з „Чырвонай Зьмены", замест якога гаворыць: „Дарагі таварыш, у палове красавіка месяца будзе сьвяткаваць свой гадовы юблей „Чырвоная Зьмена".

Няхай скупыя радкі маіх праганоў дапамогуць рэдакцыі выправіць недахопы ў сваёй практычнай працы.

Праца з арміяй юнкораў вялася зусім слаба. Капілка вопыту юнкорпрацы і наогул іншыя мэтоды кіраўніцтва адсутнічалі, кіруючы матар'ял для юнкораў і насьценгазэт амаль не друкаваўся і ня друкуецца. Падрыхтоўку да ўсе аюзнай нарады рабселькораў і яе вынікі „Чырвоная Зьмена" слаба асьвятляла. Кіраўніцтва райупаўнаважанымі па распаўсюджваньню „Ч. З." пры РК ЛКСМБ займае вузкае месца. Неабходна таксама адзначыць дрэнную пастаноўку працы літстаронкі. Да гэтага часу няма заклiку ўдарнікаў у літаратуру. Аб гэтым літстаронка маўчыць.

На гэтыя недахопы „Ч. З," неабходна зьвярнуць увагу з тым разьлікам, каб іх зьнішчыць.

Але як будзеш гаварыць аб недахопах. калі газэта за 10 год мае за сабою столькі ўпартай творчай працы, Вось зараз перада мной ляжыць усяго за тры гады сабраны архіў „Чырвонкі". За 3 гады (а не за 10) здаецца мала, Але. разгарнуўшы яго, сэрца пачынае біцца хутчэй звычайнага, цябе захапляе на працу. на барацьбу да новых практычных перамог.

Я ўжо 5 год стаю ў радох „Чырвоназьменаўцаў" дзе вырас і выхаваўся.

Я юнкор „Чырвонкі" і добра ведаю, якое адказнае імя я нясу. І ў гэты час хочацца крыкнуць: „Эх, добра жыць, калі змагаешся, працуеш і табе паказваюць шлях, даюць кірунак, а гэтай шляхавай зоркай зьяўляецца „Чырвонка".

25-га—10 год буйнага і радаснага жыцьця. 10 год упартай працы па організацыі вакол сябе працоўнай моладзі. „Чырвоная Зьмена" нясупынна змагаецца за генэральную лінію партыі.

Міхась Сухоцкі.

Займацца юбілеем няма часу

Бюро колектыву Менскай швайнай фабрыкі „Кастрычнік" дагэтуль не ставіла пытаньня аб правядзеньні юбілею „ЧЗ" і зусім не дапамагае юбілейнай брыгадзе.

Чым-же тлумачацца такія напляваецельскія адносіны да брыгады? Сакратар комсамольскага колектыву тав. Малкін, і пасобныя члены бюро лічаць, што распаўсюджваньне „ЧЗ", праверка чытаемасьці комсамольцамі газэт, кіраўніцтва юнкоррухам фабрыкі—бюро не датычаць, для гэтай працы ёсьць спэцыяльна вылучаныя, якія, да рэчы кажучы, таксама нічога ня робяць, бо бюро ў іх працы не дапамагае.

Ударная брыгада „ЧЗ"
Кавалевіч, Лешчанка.

Прасунуць „Ч. З." у маладзёжныя масы

Надыходзіць 10-ці гадовы юбілей комсамольскае газэты „Ч. З.", а комсамольцы Клімавіччыны аб ім і ўва сьне ня бачаць і адкуль яны будуць ведаць пра юбілей, калі ў Скліменскай, Пуцімельскай і інш. ячэйках ня выпісваюць сваёй газэты.

Клімавіцкаму РК ЛКСМБ трэба зараз-жа праверыць падрыхтаванасьць ячэек да юбілею „Ч. З,", і як чытаюць яе комсамольская і беспартыйная моладзь.

Купалін

Бярэце прыклад

Вучні Слуцкае школы саўгасвучу на заклік „Чырвонай Зьмены" адказалі 100 проц. падпіскай на газэту і далі 44 чал. лепшых ударнікаў у комсамол. Слуцкі саўгасвуч выклікае пасьледаваць гэтаму прыкладу Ленінскую і ЛучнікоўскуюШКМ

Янка П.

Рэволюцыйны рух на Азоўскіх выспах

ЛЁНДАН,—16. Рэволюцыйныя падзеі ў Гішпаніі сустрэлі як заўсёды жывы водгук у Партугаліі. У апошнія дні лёнданскія газэты атрымалі вестку аб росьце рэволюцыйнага руху супроць португальскага дыктатара Кармона, асабліва супроць падатковай палітыкі яго міністра фінансаў. Рэволюцыйны рух пачаўся 5-га красавіка на высьпе Мадэйра, дзе зграмадзілася да 300 палітычна - сасланых. Тут узьніклі хваляваньні, выклікаңыя, як паведамляе „Дэйлі Тэлеграф", уводзеньнем дзяржаўнай монополіі на хлеб. Мясцовы гарнізон далучыўся да паўстанцаў. Рэволюцыйная ўлада выспы абвясьціла сабе часовым урадам Португаліі, горад Таншай—часовай сталіцай Португаліі.

Праз некальві дзён пачаліся хваляваньні таксама на Азоўскіх выспах, якія, па колькі магчыма меркаваць па адрывачных вестках, знаходзяцца таксама ў руках паўстанцаў, у некаторых провінцыйных гарадох збунтаваліся гарнізоны.

Абавязкі чырвоных фабзаўкомаў Рура

БЭРЛІН, 19.—У Обэргаўзэне (Рур) адбыўся зьезд чырвоных фабзаўкомаў мэталюргічнай і горнай прамысловасьці Рурскае вобласьці. У зьезьдзе ўдзельнічала звыш 300 дэлегатаў. Дэлегаты абавязаліся правесьці на сваіх прадпрыемствах падрыхтоўку да ўсеагульнай забастоўкі, організаваць збор сродкаў у стачачны фонд і ўтварыць камітэты ўпаўнаважаных на ўсіх шахтах і прадпрыемствах.

Іскры радыё

* АТЭНЫ, 16.—Рэдактар комуністычнай газэты „Рызоспастыс", па абвінавачваньню ў зьнявазе жандарскага офіцэра прыгаворан да турэмнага зьняволеньня на 3 з паловай месяцы і да ўплаты штрафу 100 драхм.

* БЭРЛІН, 19.—У Штутгардзе адбыўся зьезд барацьбы супроць голаду і фашызму. У зьезьдзе ўдзельнічала звыш 1.000 дэлегатаў.

* ШАНХАЙ. 18.— Поліцыя арыштавала рад асоб, западазроных у комуністычнай дзейнасьці. Пры вобысках узята вялікая колькасьць першамайскай літаратуры і захоплена поўнае друкарскае абсталяваньне. Улада сьцьвярджае, што сярод арыштаваных быццам-бы знаходзіцца Лю-Вей (відны работнік кітайскай компартыі і член савецкага ўраду провінцыі Цзянсу). Большасьць арыштаваных—маладыя друкарскія рабочыя.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены"
склікаюць на 22 красавіка
ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

Абвестка дня: 1. Становішча пролетарскай беларускай літаратуры і задачы комсамолу.
2. Аб выданьні літаратурна-мастацкага грамадзка-палітычнага юнацкага часопісу.

На нараду запрашаюцца: Канакоцін (ЦК КП(б)Б), Гурскі (Галоўмастацтва), Ліманоўскі (БелАПП). Галавач, Чарот, Шамшур, Паваротны, Бялуга, Фрумкіна (Гарком ЛКСМБ), удзельнікі літаратурнай старонкі „Чырвонай Зьмены", сэкратары вытворчых колектываў КСМ і работнікі літаратурных аддзелаў рэдакцый цэнтральных газэт.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" а 7-й гадзіне ўвечары.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599